*Мялешка Ю.В., Залуцкая В.Л.*

**Хваробы ў паданнях беларусаў-сялян мінулых стагоддзяў**

Сярод беларускіх легенд аб паходжанні сусвету, зямлі, чалавека і аружаючага асяроддзя, аб штодзённым быце селяніпіна існуе таксама шмат і аб усялякіх хваробах. Асабліва людзей цікавіла, ад чаго адбываецца паморак людзей у гарадах і вёсках, ад чаго гінуць статкі хатняй жывёлы і чаму ад хвароб на целе чалавека на ўсё жыццё застаюцца сляды ад той ці іншай хваробы.

Ведучы цяжкую барацьбу з хваробамі, нашы продкі ў сваім уяўленні атаясамлівалі іх з нейкімі цёмнымі, варожымі людзям сіламі. Так з'яўляліся легенды пра нячыстую сілу, уздзеяннем якой тлумачыўся паморак людзей і хатняй жывёлы.

Хваробы часцей за ўсё ўяўляліся, як істоты (бачныя і нябачныя), якія трапляюць у канкрэтнага чалавека, з-за чаго ён і пачынае хварэць. Самы дзейсны спосаб вылячыць такога чалавека – выгнаць хваробу з дапамогай вербальнага ўздзеяння. Адным з такіх сродкаў лічыліся замовы. Да таго ж іх ўздзеянне ўзмацнялася ўжываннем лекавых сродкаў (узвараў, зёлак, напояў, абгортвання травамі і г.д.). Адзначым і тое, што ўздзеянне лекавых сродкаў у сваю чаргу так сама ўзмацнялася замовамі. Таму ў народзе існавала мноства легенд и павер'яў аб іх паходжанні, а таксама і замоў супраць усіх гэтых хвароб. Хваробы ў замовах выступалі як нешта матэрыяльнае, тое, што можна ўзяць у рукі, выгрызці, вынесці, як тое, што само прыйшло і таксама можа само адыйсці. Напрыклад, калі лячылі "пярэпалах" (іспуг) хвораму давалі піць ваду, але ваду "загаворвалі", праліваючы з адной шклянкі ў другую, праз крыж, ключы і г.д.

Такім жа чынам і эпідэміі можна таксама разглядаць, як масавае пранікненне "істот", якія выклікаюць хваробу, ва многіх людзей.

Эпідэміі, як і заразныя хваробы, апісваюцца звычайна пад абагульняючай назвай "мор" loimos (літаральна "чума"). Сугучнае з апошнім слова "памуорак" на мове простых людзей (як гаворыцца ў аднаіменнай працы славутага этнаграфіста-даследчыка А. Сержпутоўскага) азначала таксама павальную хваробу.

Як вядома, самымі распаўсюджаннымі сярод эпідэмічных хвароб былі чума, праказа, халера, воспа.

Кожнай хваробе заўсёды надаваліся свае народныя назвы, кожная з іх параўноўвалася з той ці іншай істотай. Звычайна яны выступалі ў выглядзе жанчын ці старэнькага дзядка. Сутнасць кожнай хваробы як матэрыяльнай адухоўленай істоты заўсёды падкрэслівалася апісаннем знешнасці.

У вышэйназванай працы "Памуоракъ" А. Серпужтоўскі апісвае распаўсюджванне заразнай хваробы на прыкладзе вёскі В. Рожань Слуцкага уезда, Мінскай губ. Ён апісвае метады прадухілення з'яўлення павальнай хваробы, якім карысталіся сяляне. Спачатку аўтар піша, што ў гэтай мясціне чакаўся вельмі багаты ўраджай хлеба. Але старыя казалі, што яго некаму будзе "спажываці". Яны прыводзілі прыклады, што такі ўраджай заўсёды суправаджаўся "памуоркам" і што так было ўжо ў трыдцатым годзе пры халеры. Аўтар дае па тэксце заўвагу, што сярод беларусаў і да цяперашняга часу існуе дрэнны выраз – "халера трыдцатага году" (зараз жа ў сучаснай этнаграфічнай літаратуры можна сустрэць і "халера саракавога року"). Цікава тлумачылася і з'яўленне хваробы сярод сялян. Казалі, што адзін жыхар бачыў дзвух жанчын з

доўгімі валасамі і з жахлівымі тварамі, і гэта быццам і былі “памуорак на людзей і на статакъ” (скот). Адна з іх падыйшла да маладой жанчыны, якая адразу захварэла. Калі ж яна памерла, то ўсе сяляне пачалі шкадаваць, што не пахавалі яе яшчэ пры жыцці. Бо было павер’е, што калі пахаваць жывым першага захварэўшага, то павальная хвароба ўйдзе (у Расіі, напрыклад, закопвалі і жывёлу). У другім выпадку бачылі маладую жанчыну, быццам Багародзіцу, якая плакала аб тым жа. А якое ж выйсце шукалі сяляне з гэтага становішча? Па-першае, як ім і раіла Багародзіца, пасціліся 3 дні ўсе, акрамя немаўлят. Затым мужыкі з вялікай сасны зрабілі крыж вышынёю 7 сажэняў і паставілі яго на відным месцы. У той жа дзень жанчыны саткалі доўгую хаўсціну, якой можна было абнесці царкву тры разы. На позірк сялян, гэта была ахвяра Богу. Таму на ганак царквы яны паклалі кавалачак сухога ясеню і церлі яго такім жа, пакуль не з’явіўся агеньчык, які лічыўся святым. Іскры яго былі разнесены па ўсім сялянскім хатам. Народ верыў, што толькі дзякуючы гэтым мерам, павальныя хваробы не крануліся іх .

І ў іншых месцах Беларусі, напрыклад, у Гродзенскай вобл., Карэліцкага раёна, карысталіся такімі ж метадамі даволі доўга, амаль да сярэдзіны ХХ стагоддзя (па ўспамінах жыхароў – да пачатку Вялікай Айчыннай вайны).

Таксама ў беларускіх паданнях, якія тычацца менавіта халеры, апісваецца вельмі вялікі ўраджай пакошы і жыцейка, а галоўнай дзеючай асобай выступае мокрая да руба баба і белая дзяўчына. Змест падання прыкладна такі ж, як і вышэй.

А вось у Расіі, напрыклад, халера параўноўвалася з жанчынай, лятаючай нават па паветры. Яна быццам кідала атручанае зерне ў студні, рэкі і гароды. Там супраць халеры вельмі часта ўжывалася абворванне (запашванне) месцаў жыхарства, бо лічылася, што хвароба не можа перайсці за магічную граніцу.

А вось прыклад падання пра самую страшную хваробу – чуму з кнігі “Міфы бацькаўшчыны” (укладальнік У.А. Васілевіч). “Чума... уяўляецца ў вобразе чорнай жанчыны, паветранай істоты, стыхіі, якая валодае вогненнымі стрэламі. Калі яна набліжаецца да прызначанай мясцовасці, то ператвараецца ў цёмную птушку, часцей за ўсё пугача ці саву, і носіцца ў паветры, намячае сабе ахвяры. Часам уночы, праследуючы якога-небудзь чалавека, яна кліча яго па імені і стогне, каб падарожны азірнуўся назад. Але той павінен, не азіраючыся ісці наперад і шаптаць пра сябе малітву; іначай – смертаносная красуня праткне яго сваёй стралою, чорная атрута разальецца ў крыві, і агідная смерць занясе сваю нястомную руку з касой. Складкі белага адзення Чумы шырока развяваюцца... і закрываюць ззянне месяца. Яна не церпіць ні крыку пеўня, ні сабачага брэху, таму ўсюды, дзе яна пануе, сабакі перастаюць брахаць, а петушыны спеў робіцца хрыплы (“У халеру і жаба не квакне”).

Самая распаўсюджаная замова ад чумы вельмі кароткая, але паказальная: “Чума-чумішча, ведзьма-вядзьмішча, сука-сукішча, пайдзі ты на мхі, на балоты, на сухі лек, на чортаву люльку, ад раба божыя (імя), ад яго жоўтай касці і краснай крыві. Хух, святы дух!” Тут да чумы звяртаюцца, як да жывой пэўнай істоты. Тое самае тычыцца і ўсіх іншых эпідэмічных хвароб.

Вельмі шматлікімі былі паданні пра паходжанне ліхаманкі. Вось самыя кароткія з іх.

“Ліхаманка або цёця-Ліхаманка выходзіць з зямлі восенню і вясною. Ліхаманка бывая розная, гледзячы на тое, якая цёця-Ліхаманка залезла ў цела чалавека.

Усяго гэтых цётак-Ліхаманак 12, якіх таксама завуць дачкамі цара Ірада. Іх колькасць недастатковая для ўсяго свету, таму яны толькі перыядычна наведваюць сваіх ахвяр, адсюль і зменлівы характар Ліхаманкі.”
“Трасца, шуня або хондзя – такая хвароба, якая мае постаць худое, сіняе старое паненкі. К каму яна дабярэцца да ўссядзе, той няхутка ад яе адчэпіцца...
Калі Трасца трасе, то яе хутчэй можна атагнаць, чым тую, якая толькі гняце да ломіць косці”.
Таксама вядомы народныя назвы такіх хваробаў як туберкулез, сіфіліс, цынга, гемарой, крывавы панос, бяльмо, кор (у народзе гэта – сухоты, пранцы, скарбут, пачачуй, разачка, трахома, адзёр).
Каб не паўтараць ужо вядомыя сучасныя і народныя назвы найбольш распаўсюджаных хвароб, зместы легендаў, павер’яў і замоў пра іх, паспрабуем усе вядомыя дадзеныя і кароткае апісанне іх параўнання-уяўлення звесці прыкладна ў такую табліцу:
Табліца 1

| Назва хваробы сучасная | Назва хваробы народная | Як ўяўлялася, з кім параўноўвалася | Назвы замоў супраць яе |
|---|---|---|---|
| Чума | Мор, мара, чорная немач | Чорная жанчына, паветраная істота, стыхія, якая валодае вогненнымі стрэламі | Ад чумы |
| Халера | Халера, халера 40-га року, халера 30-га року | Старая брыдкая кабета; жанчына на каровіных нагах; худой чалавек, жанчына ці карова | Ад халеры |
| Воспа | Воспік, цётка-Воспіца, Рабая, Рабуха, Шчарбачка, Ліхая | Злосная агідная старая з атрутнай слінаю, бліскучымі вачыма і адным моцным зубам, які тырчыць вонкі | Ад усяго, “ад усіх балезней” |
| Ліхаманка | Трасца, шуня, хондзя, хінцюха, варагуша, хінця, хіндзя | 12 прыстойных і падобных між сабою сясцёр; цётка-ліхаманка; 77 дачок Ірада | Ад ліхаманкі, сумесная ад хінці, цёткі, варагушы, трасцы і мноства замоў кожнай назвы паасобку |
| Бяссоніца, галаўны боль | Мара, марня | Жахлівая чорная істота, дух ці прывід | Ад галавы, ад болю, на добрае здароўе |
| Эпілепсія | Падучая або “чорная” хвароба, “пераход” | Патайнік-чараўнік | Ад падучай хваробы, “пераходу”, ад патайніку |
| Туберкулёз | Сухоты | Дзяжа з мокрым цестам | Ад сухотаў, ад сухотніка |
| Лішай | Круг | Дрэва з сырымі карэннямі | Ад кругоў, ад лішая |

Нездарма ў табліцы прыведзены і метады барацьбы супраць хвароб пры дапамозе замоў. Справа ў тым, што ўяўленням пра хваробы як нечаму матэрыяльнаму адпавядаюць і спосабы вызвалення ад іх. У лекавых замовах ад хвароб дапамагаюць хвораму розныя асобы: і сам заклінальнік з яго ўпэўненасцю ў сваю

магічную магчымасць, і фантастычныя істоты, невядомыя панны, міфічныя старыя, Бог, Прачыстая, святыя і нават продкі. Нярэдка іх задобрывалі падарункамі, запрашалі на пір. Але пры невыкананні просьбы заклінальніка, пагражалі громам і маланкаю. Бо паколькі хвароба, як нешта жывое існуе самастойна і прыходзіць да чалавека., то яе неабходна выгнаць уговорамі, пагрозамі, фізічным выдаленнем, выгрызаннем, зліваннем і г.д. Таму на кожную хваробу і існуе замова, а ў большасыці выпадкаў і некалькі розных замоў. Калі ж не было замовы, накіраванай толькі супраць адной якой-небудзь канкрэтнай хваробы, то чыталіся, напрыклад, замовы абагульненыя. Яны маглі мець назвы: "ад усіх хвароб", "ад розных хвароб", "ад усяго", "ад усіх балезней", "за здароўе", "на здароўе" і г.д.

Даволі часта гэтыя сродкі давалі станоўчыя вынікі, бо хворыя верылі ў заклінальніка і цудадзейную моц самога замоўнага рытуалу. Таму ў апошні час і не адмаўляецца роля замоў як гіпнатычнага сродку.

Вядома, з цягам часу і аджываннем старога быту, змянненнем светапогляду народа вера ў сапраўднасць легендаў, паданняў і замоў прападала, але і ў наш час вельмі цікава іншы раз азнаёміцца з ўяўленнямі пра хваробы, распаўсюджаныя асабліва у вёсках нашай краіны, сярод простых беларусаў-сялян.

Літаратура

1. Дрэва кахання: Легенды, паданні, сказы. Для ст.шк.узроту/Склад. А.І. Гурскі. Маст. Т.С. Радзівілка. – Мн.: Юнацтва, 1993. – 222 с.: іл. – (Шк. б-ка).
2. Замовы/ Уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г.А. Барташэвіч; Рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. Рэд.) і інш. – Мн.: Беларуская навука, 2000. – 597 с. – (БНТ: Беларус. нар. творчасць/НАН Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).
3. Міфы бацькаўшчыны/Беларус. Энцыкл.; Уклад. У.А. Васілевіч; Маст. Т.В. Шабунько. Мн.: БелЭн, 1994. -190 с.: іл.
4. Сержпутовский А. Памуорак// Живая старина. СПб.: Тип. М.Н.С. (Т-ва И.Н. Кушнерев и К), 1906. Вып. 4. – 88 с.
5. Торэн М.Д. Русская народная медицина и психотерапия. – СПб. АОЗТ Издательство «Литера», 1996. – 496 с.

1 Сержпутовский А. Памуорак// Живая старина. СПб.: Тип. М.Н.С. (Т-ва И.Н. Кушнерев и К), 1906. Вып. 4. – 88 с., с. 75

2 Сержпутовский А. Памуорак// Живая старина. СПб.: Тип. М.Н.С. (Т-ва И.Н. Кушнерев и К), 1906. Вып. 4. – 88 с., с. 75

3 Сержпутовский А. Памуорак// Живая старина. СПб.: Тип. М.Н.С. (Т-ва И.Н. Кушнерев и К), 1906. Вып. 4. – 88 с., с. 76

4 Міфы бацькаўшчыны/Беларус. Энцыкл.; Уклад. У.А. Васілевіч; Маст. Т.В. Шабунько. Мн.: БелЭн, 1994. -190 с.: іл., с. 100

5 Замовы/ Уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г.А. Барташэвіч; Рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. Рэд.) і інш. – Мн.: Беларуская навука, 2000. – 597 с. – (БНТ: Беларус. нар. творчасць/НАН Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору). С. 364

6 Міфы бацькаўшчыны/Беларус. Энцыкл.; Уклад. У.А. Васілевіч; Маст. Т.В. Шабунько. Мн.: БелЭн, 1994. -190 с.: іл., с. 45

7 Там жа, с. 46